# [27 кастрычніка 2023 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпускае ў абарачэнне паштовую марку «Міжнародны год проса»](https://mpt.gov.by/node/9013)




Мастак А. Міцянін. Дызайн М. Віткоўскай.

Марка друкавалася ў ДП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».

На сваёй 75-й сесіі Генеральная Асамблея ААН абвясціла 2023 год Міжнародным годам проса.

Мэта заключаецца ў павышэнні дасведчанасці пра каштоўныя пажыўныя ўласцівасці проса, яго карысць для здароўя і пра магчымасць вырошчваць гэтую непатрабавальную культуру ў неспрыяльных і зменлівых кліматычных умовах, а таксама ў прыцягненні да дадзеных пытанняў увагі органаў, адказных за распрацоўку мер палітыкі.

Праект падрыхтаваны ў супрацоўніцтве з Сакратарыятам Міжнароднага года проса.

На марцы, марачным полі і канверце Першага дня – лагатып Міжнароднага года проса.

У дзень выпуску паштовай маркі ў абарачэнне на паштамце Мінска будзе праводзіцца спецыяльнае гашэнне на канверце «Першы дзень».

Да выпуску падрыхтавана картка для картмаксімума.

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/node/9013*